**УДК 82.09**

# МАСТАЦКАЕ БАЧАННЕ ВАЕННАЙ РЭЧАІСНАСЦІ Ў АПОВЕСЦЯХ І. НАВУМЕНКІ

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуецца творчасць класіка беларускай літаратуры І.Я. Навуменкі, прысвечаная тэме Вялікай Айчыннай вайны. За аснову бярэцца жанр аповесці. На дадзенай падставе разглядаецца праблема ўзаемадачынення чалавека і ваеннай рэчаіснасці ў творчасці пісьменніка. Адным з вядучых пытанняў беларускай ваеннай літаратуры з'яўляецца даследаванне феномена чалавека, што абумоўлена павышанай цікавасцю да праблем чалавечага быцця і звязанага з дадзенай акалічнасцю пытання як мага больш праўдзівага яго адлюстравання. У аўтара сустракаюцца розныя сродкі і спосабы перадачы ваеннага і мірнага быцця. Увага надаецца непасрэднаму ўзаемавыніку спалучэння творчай спадчыны аўтара і яго біяграфіі. Аналізуюцца шляхі і нюансы літаратурнага сталення пісьменніка пры абмалёўцы праблем ваеннай рэчаіснасці.*

**Уступ.** Другая сусветная вайна была самай знішчальнай у гісторыі чалавецтва. Яна доўжылася шэсць год, ахапіла шэсцьдзесят адну дзяржаву і больш за восемдзесят адсоткаў насельніцтва зямнога шара. Ваенная тэматыка і звязаныя з ёй праблемы з'яўляюцца істотнай часткай сусветнай літаратуры сярэдзіны ХХ стагоддзя. Як трапна зазначае Э. Гурэвіч, «Падзеі Вялікай Айчыннай вайны – не толькі памяць мінулага. З усёй сваёй драматычнай сілай яны ўбіраюць у сябе сацыяльна-палітычную, маральна-псіхалагічную і філасофскую праблематыку. <…> Тыя крыніцы, што жывілі гераізм перыяду вайны, вызначаюць і цяпер прынцыпы нашага жыцця, яго маральныя асновы. Вайна неад'емна ўваходзіць у наш сучасны духоўны вопыт» [4, с. 5].

Даследуючы беларускую «ваенную» аповесць, варта прасачыць яе адметную ролю ў духоўным жыцці сучаснага грамадства. Сусветная літаратура пра Вялікую Айчынную вайну паказала невычэрпныя магчымасці чалавечай асобы. Гэта літаратура ў цэлым адвяргае вайну як бесчалавечую з'яву, павялічваючы гуманістычны патэнцыял мастацтва. «Праблематыка, вылучаная Другой сусветнай вайной, змяняецца з часам, набывае ў сусветным мастацтве большую гістарычную перспектыву, большую глыбіню. <…> Літаратуру пра другую сусветную вайну ў кожнай краіне можна зразумець толькі ў яе руху ў часе» [2, с. 6]. У сучасным успрыманні ваеннай тэматыкі індывідуальнае выступае на першы план, дамінуе паказ чалавечай асобы і яе псіхалагічнага стану. Вайна абмалёўваецца як рэальнасць жыццёвага вопыту, як перажыванне і небяспека для будучыні. Па словах В. Локун: «Сутнасць чалавека, сцвярджае літаратура аб вайне, фармуецца ў аднолькавай ступені як агульначалавечымі сувязямі, якія дэтэрмінуюць паводзіны чалавека, так і яго маральнымі якасцямі, якія гэты дэтэрмінуючы пачатак могуць значна мяняць» [8, с. 82]. Мэта беларускай «ваеннай» аповесці – узмацніць дзейнасць культуры, адшукаць новыя магчымасці спасціжэння быцця, даследаваць прычыны і мэты чалавечых учынкаў, садзейнічаць таму, каб літаратура спрыяла гуманізацыі жыцця, «ачалавечванню» героя будучыні.

**Асноўная частка.** Да Івана Навуменкі чалавечая і грамадзянская сталасць прыйшла рана і супала з гадамі суровых выпрабаванняў у гады Вялікай Айчынай вайны. Будучы арганізатарам і ўдзельнікам камсамольскага падполля ў мястэчку Васілевічы, потым разведчыкам, сувязным і байцом партызанскай брыгады імя Панамарэнкі, юнак на свае вочы пабачыў жахі акупацыі. Пасля вызвалення Палесся стаў салдатам Савецкай Арміі, прайшоў франтавымі дарогамі ад Карэльскага перашыйка да Усходняй Прусі і Сілезіі. Пасля заканчэння вайны працаваў карэспандэнтам мазырскай абласной газеты «Бальшавік Палесся», рэспубліканскай газеты «Звязда». Аўтар належыць да пісьменнікаў «філалагічнага пакалення» (завочна скончыў філалагічны факультэт БДУ). Гады вайны сталі своеасаблівымі жыццёвымі «ўніверсітэтамі», узброіўшы будучага аўтара глыбокім веданнем праблем грамадства і чалавека. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, І. Навуменка для кожнага можа быць прачытаны і ўспрыняты па-свойму.

«З усяго напісанага І. Навуменкам самыя сардэчныя, прачулыя старонкі прысвечаны яго аднагодкам, тым, хто не паспеў перад вайной скончыць дзесяцігодку, пайшоў на вайну, трапіў у партызаны, вынес на сваіх плячах выпрабаванні вайны» [5, с. 174]. Творы, змешчаныя ў зборніках «Семнаццатай вясной» (1957), «Хлопцы-равеснікі» (1958), «Верасы на выжарынах» (1960) – пра юнацтва і маладосць, апаленыя вайной, светаўспрыманне юнакоў, якое сутыкаецца з праблемамі паўсядзёнага быцця. Першыя творы займаюць істотнае месца ў літаратурнай біяграфіі аўтара. Іх варта лічыць своеасаблівай філасофска-эстэтычнай праграмай, якую Іван Якаўлевіч развіваў на працягу ўсяго жыцця. Словы, сказаныя Дз. Бугаёвым, можна

аднесці да творчасці амаль кожнага беларускага класіка, у тым ліку і да літаратуры, што прадстаўляе І. Навуменка: «Зайздросна высокія ацэнкі <…> забяспечаны самааданай літаратурнай працай пісьменніка, яго грамадзянскай мужнасцю» [1, с. 56]. Галоўным дасягненнем аўтарскіх твораў з'яўляецца адлюстраванне матыву так званай «хатняй» вайны – аднаго з самых распаўсюджаных відаў барацьбы ва ўмовах Беларусі, які працягнуты ў раманнай эпапеі пісьменніка. Пазней гэты матыў стане вызначальнай ідэяй ва ўсёй беларускай літаратуры на тэму мінулай вайны (творчасць А. Адамовіча, І. Чыгрынава).

Іван Навуменка – адзін з тых беларускіх пісьменнікаў, у творчасці якіх дамінуе прынцып аўтабіяграфізму, прапушчаны праз прызму мастацкай апасродкаванасці. Адзначым, што ў творча-выяўленчым плане адлюстравання аўтарам праблем чалавека яскрава прасочваюцца два перыяды: ваенны і пасляваенны. Матыў перажывання мінулага праз настальгічнае вяртанне ў маладосць – галоўная адзнака спадчыны аўтара. «Пафас творчасці І. Навуменкі – гэта спалучэнне рамантычнай узнёсласці і адначасова цвярозай усмешкі над гэтай узнёсласцю. <…> Гэта ўсмешка амаль заўсёды прысутнічае ў І. Навуменкі, яна як бы прыкрывае, абараняе тую ўнутраную рамантыку жыцця, якая ёсць у самой прозе жыцця, суседнічае з самой прозай, якую пісьменнік умее адчуць і перадаць не крыклівa, ціхім, шчырым голасам» [3, с. 106–107]. Магчыма, на Карэльскім перашыйку, на жорсткай непрываблівай зямлі ўпершыню абудзілася ў свядомасці будучага пісьменніка жаданне напісаць рэквіем светлай памяці сваіх аднагодкаў. «Вайна ў значнай ступені сфарміравала, вызначыла паводзіны, абудзіла талент» [6, с. 153]. Як і пісьменнікам Ю. Бондараву, Г. Бакланаву, В. Быкаву, А. Адамовічу і іншым, І. Навуменку спатрэбілася цэлае дзесяцігоддзе, каб асэнсаваць вайну. Адсюль, відаць, бярэ пачатак драматычная абвостранасць, псіхалагічная напоўненасць і згушчанасць фарбаў у перадачы псіхалагічнага стану галоўных герояў пісьменніцкіх аповесцей. Трэба адзначыць, што станаўленне творчага таленту аўтара праходзіла пад уплывам школы Я. Коласа і К. Чорнага.

Пісьменнік ярка выражанага лірычнага складу, І. Навуменка ў пачатку сваёй творчасці (апавяданні, аповесці) не прэтэндаваў на глабальны ахоп адлюстравання рэчаіснасці. Часцей за ўсё ў дадзеных жанрах аўтар абмяжоўваўся адлюстраваннем аднаго эпізоду, аднак «у адным эпізодзе цалкам праступала ўсё жыццё асобы, калектыва, а часам нават і ўсяго народа» [12, с. 218]. Навуменка з самага пачатку авалодваў уменнем паказаць душэўны стан героя праз яго паводзіны, знешнія прыкметы, а таксама сувязь з прыродай і роднай зямлёй. Так, у аповесці «Замяць жаўталісця» чытаем: «Штосьці ў ім [Высоцкім] адбывалася – яно нібы вынікала з глыбіні істоты, з патаемных куточкаў душы, яднаючыся з зямлёй, зорным верасеньскім небам, агнямі зарэчнага горада» [7, с. 284]. Трэба дадаць, што аўтар паказваў героя знутры, высвятляючы матывы ўчынкаў апошняга. Даследуючы ўнутраны свет героя, празаік псіхалагічна пераканаўча раскрываў паэзію пачуццяў, праўду душэўных перажыванняў. Герой пісьменніка – чалавек інтэлектуальны, здольны глыбока разумець прыроду і аддавацца пачуццям. Сутнасць вобраза галоўнага героя можа быць адлюстравана праз выказванне Т. Шамякінай: «Чалавек – гэта Бог, калі толькі ён – Чалавек» [11, с. 262]. Пейзаж, падзеі адыгрываюць у аповесцях аўтара і функцыю перадачы вонкавых, тыповых абставін. У час мірнага жыцця яны па-філасофску спакойныя: «Добра ў лесе – нават у такім вось асеннім. Будзённы клопат, надакучлівя думкі сплываюць, дыхаецца, думаецца лёгка» («Развітанне ў Кавальцах») [7, с. 457]. Могуць быць і строга рэалістычныя (для канцэнтрацыі сітуацыі): «Ёсць яшчэ больш цесная, страшная сувязь паміж Чарнобылем і трыццаць сёмым годам, Чарнобылем і апошняй вялікай вайной» («Гасцініца над Прыпяццю») [10, с. 35]. Побач з чалавекам заўсёды ідзе каханне (нават у самыя драматычныя моманты яго жыцця). Вайна спрыяе абвастрэнню людскіх пачуццяў і перажыванняў: «Без кахання на вайне нельга. Сілу салдату дае думка пра родны кут і пра самых блізкіх людзей» [7, с. 327]. У творчасці аўтара яскрава прасочваецца тэндэнцыя трансфармацыі пачуцця кахання: ваеннае каханне – чыстае, уздымнае (яго варта назваць сапраўдным быццём), а пасляваеннае пачуццё – нешчаслівае, разбуральнае (больш нагадвае небыццё). Дадзенае чалавечае пачуццё займае асаблівае месца ў сацыяльнай характарыстыцы як ваеннага, так і пасляваеннага перыядаў. Вайна, як арэна небыцця, абвастрае ўсё лепшае ці горшае ў чалавечым характары. Навуменка імкнецца ідэалізаваць ваеннае каханне (напоўніць узвышаным аптымізмам, можна сказаць, паставіць яго ў апазіцыю небыццю): «Што такое прыгажосць, харараство, каханне, узвышаныя пачуцці – на гэтыя пытанні, здаецца, не можа адказаць ні матэрыялізм дыялектычны, ні гістарычны» («Край пяшчаны, балотны») [7, с. 180].

Чалавек павінен перабудаваць свет на падставе дабра і справядлівасці, а дзеля гэтага, паводле І. Навуменкі, ён павінен пачаць перш за ўсё з самога сябе. У жыцці самім па сабе няма наогул ніякага раз і назаўсёды зададзенага ці вызначанага сэнсу. Толькі сам чалавек свядома або стыхійна, накіравана або адвольна, самім спосабам свайго быцця надае яму сэнс і тым самым стварае сваю чалавечую сутнасць – вось агульны тэзіс, вызначаны класікам. Побач з тым актуальна гучыць матыў безабароненасці і закінутасці чалавека ў гады вайны (і ў мірны час таксама), што як лейтматыў праходзіць праз усю творчасць аўтара. Аповесць І. Навуменкі «Снежань» пачынаецца радкамі: «На свеце быў снежань, сумны, бясснеж-

ны. Аднастайна і нудна гулі вечарамі тэлеграфныя слупы з абарванымі правадамі. <…> Правады былі мёртвыя. <…> Куды яны беглі? Да вайны, мабыць, у самую Маскву, а цяпер – нікуды» [7, с. 280].

Івана Навуменка крытыка называе прадстаўніком маральна-этычнага напрамку ў сучаснай беларускай прозе. Для творчасці аўтара ў сувязі з адзначанай акалічнасцю характэрны разгляд праблемы выратавання чалавечай душы – зварот чалавека да свайго ўнутранага Я, да свайго сумлення. У розных выпадках аўтар бачыць адзінае выйсце – чалавек павінен дзейнічаць па законах сумлення, не зважаючы на знешнія абставіны. Быццё ў аўтарскім разуменні – гэта неад'емная частка чалавечага мікракосму, арганічнае ўпляценне ў нізку своеасаблівага «чалавечага кола». Менавіта праз акцэнтуацыю псіхалагічных момантаў, асабістыя перажыванні лірычнага героя, яго стасункі з іншымі людзьмі І. Навуменка (паводле аўтарскай манеры) раскрывае сутнасць быцця і дае яму своеасаблівую стрымана-завуаляваную характарыстыку. Так, для ваеннай прозы пісьменніка характэрна завостранаўзнёслае светаадчуванне, пры якім пачуцці і перажыванні чалавека падаюцца сапраўднымі і трывалымі. Навуменка мэтазгодным лічыць па-знанне чалавекам ісціны ў працэсе яго рэалізацыі як асобы ў соцыуме наогул (і на вайне ў прыватнасці).

Пісьменнік у аповесцях, прысвечаных ваеннай тэматыцы, пераважным лічыць служэнне чалавека на карысць сваёй краіны, іншых людзей; падкрэслівае неабходнасць самаахвярнасці асобы ў імя розных акалічнасцей, што з'яўляюцца сітуацыйна непазбежнымі: «Ёсць людзі, якія свядома ідуць на смерць. Людзі ідэі. Гэта партызаны, падпольшчыкі, наогул, людзі не скораныя духам. Іх многа, многія тысячы» («Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва») [9, с. 391]. Аднак асобныя радкі твораў трансфармуюць пазіцыю самога аўтара ў дачыненні да пытанняў фізічнага жыцця чалавека, надаючы ім прыярытэтнае значэнне ў апазіцыі гераічнай, самаахвярнай смерці: «Я чытаў раман Рэмарка «На Заходнім фронце без перамен». Яго старонкі дыхаюць пракляццем вайне. Бо і там чалавек пастаўлены перад сцяной перашкод, якія асабіста адолець не можа. Ён сядзіць у акопе і чакае смерці. Гэтае чаканне і ёсць сучасная вайна» («Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва») [9, с. 391].

Праз жанр аповесці І. Навуменкі яскрава прасочваецца лінія сталення аўтара, маральнае ўсведамленне і пераасэнсаванне падзей вайны ад узвышана-ўзнёслага да асэнсавана-ўсвядомленага: «Пра вайну таксама пісалася праўда, толькі як бы ўсечаная: пра адступленні, акружэнні гаворкі не было, а калі дзе-небудзь мімаходзь успамінаўся палон, то герой трапляў туды толькі паранены – інача й не было яму апраўдання» («Замяць жаўталісця») [7, с. 302]. У кнізе «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва» прысутнічае дыялог падлетка Васіля Войціка са сваім дзедам, у якім пісьменнік яскрава выказвае свае адносіны да ваенных падзей: « – Чаму ты, дзед, не быў на вайне? – Хай на яе ліха, на тую вайну, унучак. Нічога добрага там няма. Смерць, забойства» [8, с. 27].

Пераканаўча, без прыфарбаванняў, аўтар паказвае ваенны быт – складанасці з забеспячэннем харчамі, надзённыя патрэбы шэраговага ўдзельніка, душэўны стан чалавека: «Ніякіх высокіх трыванняў, імкненняў. <…> У час доўгіх паходаў мы маўчым. Нікому не хочацца гаварыць. <…> На вайсковай службе не так многа радасцей і найвялікшая з іх – пад'есці» («Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва») [9, с. 371]. У многім, на думку пісьменніка, у жудаснай вайне людзям дапамагла перамагчы вера ў высокі пачатак, у ідэалы, якая падтрымлівала баявы дух салдата: «Я толькі год на фронце, але, можна лічыць, удзельнічаю ў вайне з самага пачатку. <…> Без ідэалаў, якія ўвабралі ў свае душы з дзяцінства, мы не мыслілі далейшага лёсу» («Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва») [9, с. 378].

«Ён больш аптыміст, чым песіміст, – піша пра І. Навуменку В. Каваленка, – бо як пісьменнік дэмакратычных перакананняў больш за ўсё верыць у народную энергію жыццятворчасці, чым у інтэлігенцкую…» [5, с. 11]. Тым не менш нельга сцвярджаць адназначна, што простыя людзі валодаюць шырэйшымі магчымасцямі быць самімі сабой, здзяйсняць гераічныя ўчынкі на карысць кагосьці ці чагосьці, што на іх менш уплывае дыктат рэжыму ці палітычныя плыні часу: на вайне чалавек раскрываецца ў тым ці іншым ракурсе незалежна ад свайго сацыяльнага статусу.

Подзвігам духу можна лічыць аўтарскае амаль біблейскае ўседараванне ворагам сваім: «Не было да гэтых людзей ніякай нянавісці, а толькі жаль і нават спагада…Пачуцця помсты да немцаў не было, наадварот, распірала грудзі нястрымная радасць ад таго, што вайна канчаецца. Салдаты сорак пятага <…> адчулі сябе сцяганосцамі міру, дабра, справядлівасці» («Замяць жаўталісця») [7, с. 326].

**Заключэнне.** Такім чынам, творы І. Навуменкі як пісьменіка-гуманіста нясуць зарад творчай энергіі, падкрэсліваючы аптымістычны пачатак жыцця, паказваючы дэструктывізм ваенных дзеянняў. Падсумоўваючы сказанае, спашлемся на словы В. Юрэвіча, сказаныя ў адрас аўтара: «Ці піша ён пра вайну, ці пра мірныя будні, галоўны клопат пісьменніка той, каб яго герой інтэлектуальна, эмацыянальна і маральна быў на ўзроўні патрабаванняў нашага часу <…>. Чытаючы і перачытваючы кнігі І. Навуменкі, здзіўляешся таму, як ашчадна захоўвае ён у памяці сустрэчы і развітанні, радасці і нягоды, юнацкія мары і

суровую праўду быту, вобразы сяброў і ворагаў. І да перажытага ён звяртаецца з думкай пра дзень сённяшні, з заглядам у дзень заўтрашні. Мэта гэтых пісьменніцкіх зваротаў – ухваліць чалавека, які жыве сярод людзей, разам з людзьмі, дзеля людзей» [12, с. 235].

ЛІТАРАТУРА

1. Бугаёў, Дз. Арганічнасць таленту / Дз. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 351 с.
2. Вторая мировая война в литературе зарубежных стран / П.М. Топер [и др.]; под общ. ред. П.М. Топера. – М.: Наука, 1985. – 616 с.
3. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: у 2 т. / рэдкал.: В.В. Барысенка, В.У. Івашын (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – Т. 2: 1941–1964 / М.М. Барсток [і інш.]. – 1966. – 606 с.
4. Гурэвіч, Э. Пафас гераізму / Э. Гурэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 208 с.
5. Каваленка, М.А. Беларускія пісьменнікі-лаўрэаты / М.А. Каваленка. – Мінск: Дзярж. Бібл., 1987. – 310 с.
6. Ламека, Л. Сучасная беларуская літаратура: аналіз твораў / Л. Ламека, Н. Ламека. – Мінск: Кніжны дом, 2003. – 384 с.
7. Навуменка, І. Выбраныя творы: у 2 т. / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 2 т.
8. Локун, В.І. Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы. 1950–1960-я гады / В.І. Локун. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 109 с.
9. Навуменка, І. Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва / І. Навуменка. – Мінск: Юнацтва, 1997. – 527 с.
10. Навуменка, І. Гасцініца над Прыпяццю / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 252 с.
11. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.
12. Юревич, В. Испытание зрелостью / В. Юревич. – М.: Сов. писатель, 1981. – 256 с.

*Паступіў 20.06.2014*

## THE ARTISTIC VIEW OF WAR REALITY IN THE NARRATIVE BY I. NAVUMENKA

***T. BAGARADAVA***

*The article contains the analysis of works by I.Y. Navumenka dedicated to the Great Patriotic War. The problem of person-war reality interaction in the narrative by I.Y. Navumenka is studied. One of the key questions of Belarusian war literature is the investigation of personality phenomenon, as well as the heightened interest towards the problems of human existence, and the interrelated question of giving the true picture of it. The author takes advantage of various means of representation of war and peaceful existence. The article is concentrated on the biographical aspect of works by I.Y. Navumenka. The ways and shades of literary maturation of the author description are analysed on the material of war reality.*